Біблія для дзяцей
прадстаўляе

# Калі Бог стварыў усё





Аўтар: Edward Hughes

Ілюстратар: Byron Unger; Lazarus; Alastair Paterson

Адаптаваў: Bob Davies; Tammy S.

Пераклаў: Christian Lingua

Выдавец: Bible for Children
www.M1914.org

©2020 Bible for Children, Inc.
Ліцэнзія: Вы маеце права капіяваць ці друкаваць гэтую гісторыю, але не ў камерцыйных мэтах (не прадаваць яе).


Хто стварыў нас? Слова Божае, Біблія, распавядае нам, з чаго пачалося чалавецтва. Вельмі даўно Бог стварыў самага першага чалавека і
назваў яго Адамам.


Бог стварыў Адама з праху
зямнога. Калі Бог удыхнуў жыццё
ў Адама, той ажыў. Ён апынуўся
ў выдатным садзе
пад назвай
Эдэм.

Перад тым, як стварыць Адама,
Бог стварыў цудоўны свет,
напоўнены выдатнымі рэчамі.



Крок за крокам Бог ствараў пагоркі і стэпавыя прасторы, духмяныя кветкі і высокія дрэвы, ярка апераных птушак і шумлівых пчолак, няўклюдных кітоў і слізкіх слімакоў.



На самой справе, Бог зрабіў усё, што існуе – літаральна ўсё.



Напачатку, калі Бог яшчэ нічога не стварыў, не было нічога, акрамя Бога. Не было людзей, не было аніякага месца або рэчы. Нічога.



Не было святла і
цемры. Не было
верху і нізу. Не
было ўчора і
заўтра. Быў
толькі Бог,
Які не мае
пачатку. І
тады Ён пачаў
дзейнічаць!



На пачатку Бог стварыў
неба і зямлю.

І зямля была
бясформенная
і пустая.
І была
цемра
над



безданню.

Тады Бог казаў.
“Няхай будзе
святло”.



І з'явілася святло. І Бог назваў святло днём, а цемру ноччу. І быў вечар, і была раніца: першы дзень.



На другі дзень Бог размясціў ваду акіянаў, мораў і азёраў пад нябёсамі і аблокамі. На трэці дзень Бог сказаў:



“Няхай будзе суша”
І гэтак здарылася.


Бог наказаў з'явіцца траве, і
кветкам, і хмызняку, і дрэвам.
І яны з'явіліся.
І быў вечар,
і была раніца:
дзень трэці.

Тады Бог стварыў сонца, месяц і так багата зорак, што ніхто не можа пералічыць іх.  І быў вечар, і была раніца: дзень чацвёрты.



Марскія істоты, рыбы і птушкі былі наступнымі ў Божым спісе спраў.  На пяты дзень ён стварыў вялікую меч-рыбу і малюсенькіх сардзінак, даўганогіх страусаў і шчаслівых маленькіх калібры.



Бог стварыў кожны від рыбы, што запоўніла ваду, і ўсе віды птушак, якія радасна ляталі ў небе над зямлёй і морам. І быў вечар, і была раніца: дзень пяты.



Пасля гэтага Бог зноў прамовіў. Ён сказаў: "Няхай уродзіць зямля жывых істот..." Так на свет з'явіўся кожны від жывёлін, насякомых і паўзуноў. Гэта былі сланы, ад тупату якіх трэслася зямля, і ўвесь час занятыя бабры.



Гарэзныя малпачкі і непаваротлівыя кракадзілы. Вёрткія чарвякі і нахабныя бурундукі.  Цыбатыя жырафы і варкочучыя каты.  У той дзень Бог стварыў кожны від жывёлін.  І быў вечар, і была раніца: дзень шосты.



Бог зрабіў яшчэ нешта на шосты дзень – нешта вельмі асаблівае.

Усё цяпер было гатова для паяўлення Чалавека. Была ежа на палях і жывёлы, каб служыць яму.



І Бог сказаў: “Створым чалавека па вобразу Нашаму. Няхай ён будзе гаспадаром над усім на зямлі.” І СТВАРЫЎ БОГ ЧАЛАВЕКА ПАВОДЛЕ ВОБРАЗУ СВАЙГО; ПАВОДЛЕ ВОБРАЗУ БОЖАГА ЁН СТВАРЫЎ ЯГО.



Бог сказаў Адаму.
“Ешце з саду тое,
што вы хочаце.
Але нельга
есці толькі ад
дрэва пазнання
дабра і зла. Калі
вы з’ясце з гэтага
дрэва, вы памраце.”



І сказаў Гасподзь Бог: “Не добра, што чалавек павінен быць адзін. Я зраблю яму памочніка”. Бог прывёў да Адама ўсіх птушак і звяроў. Адам даў ім усім імёны.



Безумоўна, ён быў вельмі разумным, калі мог гэта зрабіць. Але сярод усіх птушак і звяроў для Адама не знайшлося прыдатнага партнёра.



Бог зрабіў так, што Адам глыбока, глыбока заснуў. Потым Бог выдаліў з яго цела адну з рабрын і стварыў з яе жанчыну. Створаная Богам жанчына цалкам падыходзіла Адаму ў якасці партнёра.



Бог стварыў усё за шэсць дзён.
І потым Бог благаславіў
сёмы дзень, і зрабіў яго днём
адпачынку. Адам і яго жонка
Ева шчасліва жылі ў …




…Эдэмскім садзе,
падпарадкоўваючыся Богу.
Бог быў іх Гаспадзь, Ён
забяспечваў іх усім
неабходным, а таксама
Ён быў ім Сябрам.

Калі Бог стварыў усё

Гісторыя з Божага Слова, Бібліі

знаходзіцца ў

Быццё 1-2

"Сведчанне словаў Тваіх прасвятляе."
Псалтыр 119:130

Канец

Гэтая Біблейская гісторыя
распавядае нам пра цудоўнага Бога,
Які стварыў нас, і хоча, каб вы ведалі Яго.

Бог ведае, што мы рабілі дрэнныя справы,
якія Ён называе грахом.  Пакаранне за грэх
ёсць смерць, але Бог любіць вас так моцна,
што Ён паслаў Свайго адзінага Сына, Ісуса,
памерці на крыжы і панесці пакаранне за
вашыя грахі.  Потым Ісус уваскрэс з
мёртвых і вярнуўся дадому, на нябёсы!
Калі вы паверыце ў Ісуса і папросіце Яго
прабачыць вашыя грахі, Ён зробіць гэта!
Ён прыйдзе і цяпер будзе жыць унутры
вас, а вы будзеце жыць з Ім вечна.

Калі вы верыце, што гэта праўдзіва, скажыце Богу наступнае: Дарагі Ісус, я веру, што Ты Бог і стаў чалавекам, каб памерці за мае грахі, і цяпер Ты зноў жывы.  Калі ласка, увайдзі ў маё жыццё і прабач мае грахі, каб я мог мець новае жыццё цяпер, і аднойчы прыйсці да Цябе, каб быць з Табой назаўжды.  Дапамажы мне слухацца Цябе і жыць для Цябе, як Тваё дзіцё.  Амін.

Чытай Біблію і размаўляй з Богам кожны дзень!   Ян 3:16